ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 175 (1142) ПЯТНІЦА, 1-га жніўня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Сёньня міжнародны Чырвоны дзень

Ленінскі комсамол—орган затар баявых атрадаў рабочай моладзі, будзе аддана змагацца ў першых шэрагах барацьбітоў за сусьветны Кастрычнік

Комсамольцы і працоўная моладзь, узмацняйце абарону краіны, шэрагі Чырвонай арміі і асоавіяхіму!

Сьцяг Леніна ўзьнімем над усім сьветам

Імпэрыялістычным акулам, фашыстым, соцыял-здраднікам ня удасца сарваць рэволюцыйных выступленьняў пролетарыяту—супроць падрыхтоўкі новай імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР, за сусьветную пролетарскую рэволюцыю

Вайна—імпэрыялістычнай вайне!

Пад сьцягам ленінізму—за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады

ПРЭЧ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ВОЙНЫ! НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ!

ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ БССР

Таварышы!

Шаснадцаць год таму назад імпэрыялістычная буржуазія пры садзейнічаньні соцыял-дэмократыі кінула ў крывавую бойку мільёны працоўных. **На працягу гэтай вайны забіта 10 мільёнаў і пакалечана каля 19 мільёнаў чалавек.** Крывёй працоўных буржуазія імкнулася **разьвязаць супярэчнасьці капіталізму, замацаваць сваё панаваньне і ўзмацніць экспл'ёатацыю працоўных.**

Толькі пераможная пролетарская рэволюцыя ў Расіі, якая **пeратварыла вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую,** і паўстаньні рабочае клясы ў іншых краінах прымусілі буржуазію скончыць вайну.

Дзесяць год прайшло з таго часу, як Чырвоная армія, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і пры непасрэдным удзеле ўсіх працоўных разьбіла буржуазна-абшарніцкія белагвардзейскія арміі, дала руйнуючы адпор арміям міжнароднай буржуазіі, якія спрабавалі задушыць краіну Саветаў, зьнішчыла контр-рэволюцыйныя банды і стварыла ўмовы для мірнага соцыялістычнага будаўніцтва.

За гэты кароткі час **рабочае кляса і працоўнае сялянства пад Ленінскім кіраўніцтвам комуністычнай партыі аднавілі гаспадарку СССР і значна перашагнулі даваенны ўзровень разьвіцьця.** Зараз мы вырашаем вялізарнейшыя задачы **індустрыялізацыі краіны і колектывізацыі сельскай гаспадаркі,** робім гіганскія крокі па шляху **пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва і ажыцьцяўляем наступленьне соцыялізму па ўсяму фронту.**

У гэты-ж час краіны капіталізму перажываюць **востры гаспадарчы крызіс: зачыняюцца фабрыкі і выкідаюцца на вуліцу мільёны працоўных.** Расьце беднасьць шырокіх **колаў працоўнага насельніцтва** побач з шалёнай пышнасьцю і багацьцем буржуазіі.

У гэтых умовах абвастраецца **клясавая** барацьба пролетарыяту і ўсіх працоўных мас. Забастоўкі і масавыя дэмонстрацыі пераходзяць у вулічныя бойкі з паліцыяй і войскамі. **Рэволюцыйным пажарам гарыць Кітай, Індыя і інш. колёніяльныя краіны.**

Сударагамі шалёнага тэрору адказвае буржуазія на рэволюцыйны рух працоўных. Буржуазія і соцыял-фашысты растрэльваюць мірныя дэмонстрацыі рабочых і сялян, гнояць у вастрогах і забіваюць сотні лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы.

Зашчэмлены ў ціскі экономічнага крызысу і рэволюцыйнага руху працоўных, міжнародны імпэрыялізм пры дапамозе соцыял-фашызму шалёна рыхтуецца да новых боек і свае гарматы накіроўвае, **у першую чаргу, супроць Савецкага Саюзу.** Буржуазія ведае, што **хуткі рост соцыялізму ў нашай краіне зьяўляецца вялізарнай крыніцай рэволюцыйнай энэргіі пролетарыяту ўсяго сьвету і рыхтуецца ўзброенай сілай раздушыць краіну будуючагася соцыялізму.** Мы бачым гэтую падрыхтоўку па грамадным росьце ўзброеньня капіталістычных армій, **у хвалях антысавецкіх кампаній,** у бязьлітаснай крывавай расправе з рэволюцыйнымі рабочымі і сялянамі па тэй бок савецкіх межаў.

ТАВАРЫШЫ! Мы павінны памятаць аб вайсковай небясьпецы, якая нам пагражае і ўсімі сіламі рыхтавацца да абароны соцыялістычнай бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету—СССР.

На падставе рашэньняў XVI партзьезду адзінаправільнай ленінскай лініі партыі, супроць праваг у ўхілу, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай ва ўмовах разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва і „левага“ ўхілу,—цясьней згуртуем шэраг для соцыялістычнага наступленьня па ўсяму фронту. **Выканаем пяцігодку ў чатыры гады.** Будзем разгортваць колектывізацыю сельскай гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, памятуючы, што кулак зьяўляецца вернай апорай міжнароднага капіталізму.

Будзем узмацняць **абарону нашае краіны, выконваючы і перавыконваючы прамфінплян, поўнасьцю рэалізуем пазы у „пяцігодка ў чатыры гады“,** мобілізуем сілы працоўных на выкананьне задач уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаній, на вырашэньне задач жывёлагадоўлі.

Палітыка савецкае ўлады—гэта палітыка міру. **Мы ня хочам вайны. Але мы павінны быць гатовы да абароны. Мы будзем узмацняць абарону шляхам разгортваньня работы Асавіяхіму, шляхам сталай дапамогі рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.**

Капіталізм прыгнечвае нацыянальныя меншасьці. Толькі ў краіне пролетарскай дыктатуры сапраўды роўны працоўныя ўсіх нацый. Толькі ў СССР няма прыгнечаных нацый. **Узмацнім інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас. Узмацнім дапамогу політзьняволеным буржуазных краін. Будзем памятаць аб ахвярах сусьветнага фашызму, аб палоньніках капіталу, якія змагаюцца супроць новых войн, змагаюцца за абарону СССР.**

Першага жніўня ў Міжнародны Чырвоны Дзень працоўныя ўсяго сьвету ўзьнімуць **голас протэсту супроць ваенных плянаў міжнароднага імпэрыялізму, супроць падрыхтоўкі нападу на Савецкі Саюз.**

Таварышы! Пад сьцягам комуністычнай партыі організоўвайце свае сілы для **больш актыўнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве.** Рыхтуйцеся для барацьбы за зьнішчэньне капіталістычнага ладу.

Працоўныя жанчыны! Толькі дыктатура пролетарыяту і соцыялізм даюць поўнае **аслабаненьне жанчыны.** Организуйцеся для барацьбы **за соцыялістычнае будаўніцтва.** Протэстуйце супроць **крывавага капіталізму, супроць новых імпэрыялістычных войн. Узмацняйце абароназдольнасьць СССР.**

Цясьней шэрагі вакол Ленінскай комуністычнай партыі!

Усе ў шэрагі Асоавіяхіму! Усе за падрыхтоўку да абароны!

Узмацнім дапамогу нашым зарубежным братом па барацьбе!

Няхай жыве СССР—соцыялістычная бацькаўшчына ўсіх працоўных. Прэч імпэрыялістычныя войны! Няхай жыве сусьветная рэволюцыя! Няхай жыве Комінтэрн—штаб сусьветнай рэволюцыі!

Цэнтральны Савет Профсаюзаў БССР.

Цэнтральны Савет Асоавіяхэм БССР.

Цэнтральны Камітэт МОПРУ БССР.

Праверым сваю баявую гатоўнасьць

Сьвяткаваньне Чырвонага Дню пролетарыят і комсамол будзе праводзіць пры наяўнасьці разгорнутай падрыхтоўкі капіталістычных акул да новых імпэрыялістычных боек і у першую чаргу,—падрыхтоўкі нападу на СССР—бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету.

Комсамол БССР, як і комсамол усяго Савецкага Саюзу разам з усімі працоўнымі будуць праводзіць дзень 1-га жніўня, як дзень масавай грамадзка-політычнай кампаніі,—праверкі абароназдольнасьці краіны Саветаў і Чырвонай Арміі, вернага вартаўніка соцыялістычнага будаўніцтва, пад лёзунгам узмацненьня шпаркіх тэмпаў выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады, пабудовы новых буйных фабрык і заводаў, соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, выкарчоўваньня капіталістычных элемэнтаў у вёсцы, павялічага ўдзелу комсамольскіх організацый ў Асо-авіяхэмаўскіх організацыях, якая зьяўляецца асноўнай масавай грамадзкай організацыяй па падрыхтоўцы працоўных да абароны краіны.

Хутка цачынаецца чарговы прызыў у Чырвоную Армію, комсамол павінен неадкладна распачаць падрыхтоўчую працу, організаваць яшчэ больш грамадзкай думкі вакол сучасных задач, якія стаяць перад Чырвонай Арміяй, вакол пытаньняў міжнароднага становішча сярод комсамольскіх мас і працоўнай моладзі. Дабіцца прыкладнасьці прызыўнікоў і ў першую чаргу комсамольцаў, недапускаючы ніводнага соцыяльна-варожага нам элемэнту ў Чырвоную Армію.

Комсамол павінен яшчэ больш узмацніць сатаварыскую працу з вайсковымі часткамі, палепшыць



ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, яшчэ большага ўзмацненьня інтэрнацыянальнага выхаваньня шэрагаў комсамолу і працоўнай моладзі, узмацненьня матар'яльнай і моральнай дапамогі замежным братом па клясе.

Комсамол Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам компартыі быў у першых шэрагах слаўных барацьбітоў за заваёвы Кастрычніка.

Сёньня комсамол Беларусі павінен яшчэ раз праверыць сваю баявую гатоўнасьць на выпадак нападу імпэрыялістычных акул на краіну Саветаў.

Праверыць сваю гатоўнасьць для таго, каб у любую хвіліну замяніць варштат і кнігу на вінтоўку—стаўшы ў першыя шэрагі байцоў Чырвонай Арміі.

Сёньня комсамол павінен праверыць, як выконваецца дырэктыва партыі і ЦК УсеЛКСМ аб абавязковым вайсковым навучаньні ўсіх комсамольцаў.

Гаворачы аб узмацненьні вайсковай падрыхтоўкі комсамольцаў, нельга прайсьці міма факту нездавальнай працы шэфства над чырвоным марскім флётам.

Стоячы на варце генэральнай лініі партыі,—выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады, рэконструкцыі с-г на базе колектывізацыі змагаючыся за найхутчэйшае распаўсюджваньне новай пазыкі рашуча біць па правых опортун.стых і „левых“ загібшчыках, змагаючыся з усялякімі ўхіламі ў нацыянальным пытаньні накіроўваючы галоўны ўдар па вялікадзяржаўнаму шовінізму.

Ня гледзячы на ўсе перашкоды з боку буржуазіі, соцыял-дэмократаў, фашыстых і іншых лёкаеў буржуазіі, якія накіроўваюць усю сваю сілу і сродкі на зрыў першажнівеньскіх выступленьняў працоўных—гэты дзень усё-ж будзе днём рэволюцыйнага выступленьня і дэмонстрацый працоўных мас усяго сьвету супроць імпэрыялізму, у абарону СССР, будзе днём узмацненьня сіл пролетарыяту пад сьцягам Комінтэрну за сусьветны Кастрычнік, у якім сусьветны комсамол будзе на першых позыцыях.

Т.

Будзем заўсёды на варце!

Сударгамі шалёнага тэрору адказвае буржуазія на рэволюцыйны рух сусьветнага пролетарыяту.—Буржуазія і социял-ф... шысты растрэльваюць сотні тысяч лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы

Прасякнутыя духам баявога інтэрнацыяналізму рэволюцыйныя пролетары ўсяго сьвету пад сьцягам Комінтэрну рашуча выступаюць супр... крывавага тэрору фашыстых, гэроічна змагаюцца за зьнішчэньне капіталістычнага ладу

Міжнародны Чырвоны дзень

Першае жніўня ёсьць дзень міжнароднае барацьбы рэволюцыйнага пролетарыяту супроць небясьпекі імпэрыялістычных войнаў, і ў першую чаргу супроць падрыхтоўкі вайны і нападу на Савецкі Саюз, які зьяўляецца социялістычнаю бацькаўшчынаю міжнароднага пролетарыяту.

На 6-м конгрэсе Комуністычнага Інтэрнацыяналу ў 1928 годзе было ўхвалена штогодна праводзіць 1-га жніўня Міжнародны Чырвоны дзень. Першы раз ён праводзіўся ў мінулым годзе. Гэта была вялізарнейшая дэмонстрацыя міжнароднае солідарнасьці рабочых, іхняе рашымасьці не дапусьціць новых імпэрыялістычных войнаў, не дапусьціць нападу на савецкія рэспублікі.

Барацьбу супроць вайны рабочая кляса зьвязвала з сваёй агульнаю экономічнаю і палітычнаю барацьбою супроць капіталу, супроць фашыстых і фашысцкае социял-дэмократыі. Шмат дзе дэмонстрацыі скончыліся сутычкамі з паліцыяй, шмат дзе былі параненыя і забітыя, бо буржуазія ўсе сілы прыкладала, каб перашкодзіць міжнароднай пролетарскай пераклічцы.

У гэтым годзе 1-е жніўня, праследуючы, у асноўным, тыя-ж мэты, пройдзе ў новых умовах, што, бязумоўна, накладзе пэўны адбітак на яго лёзунгі.

За мінулы пэрыод з асобай выразнасьцю выявілася, што капіталістычныя краіны ідуць па шляху бесьпераннага экономічнага ўпадку.

Гэты экономічны крызіс характэрны тым, што ён паразіў галоўную краіну капіталізму—Амэрыку, і што ён пераблытаўся з сельска-гаспадарчым крызісам у аграрных краінах. Гэты крызіс „зьяўляецца самым сур'ёзным і самым глыбокім крызісам, з усіх крызісаў якія адбываліся да гэтага часу, сусьветным экономічным крызісам" (Сталін).

На глебе крызісу абвастраюцца ўсе супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы. Ні адна раіва зараз не абмяжоўваецца ўзмацненьнем толькі экономічных сваіх позыцый. Мноства конфэрэнцый скліканых, быццам-бы ў інтарэсах разбраеньня, фактычна зьяўляюцца толькі дымавой заслонаю, за якою адбываецца бесьперапынны рост узброеньня.

Абвастрэньне міжнародных супярэчнасьцяй непазьбежна ўзмацняе небясьпеку новай імпэрыялістычнай вайны і нападу на СССР.

Буржуазія супроць пролетарскіх калён у дзень першага жніўня выпусьціць разам з паліцыяй і сваіх паслугачоў—социял-дэмократычныя партыі рознага колеру.

Але яны ня ў моцы зьмяніць таго становішча, што стабілізацыі капіталізму прыходзіць канец, што сусьветны экономічны крызіс перарастае ў крызіс палітычны, што „пролетарыят, змагаючыся з капіталістычнай эксплёатацыяй і ваеннай небясьпекай, будзе шукаць выхаду ў рэволюцыі". (Сталін).

1-га жніўня будзе яшчэ адной вехай па шляху да сусьветнай рэволюцыі.

Я. Субач

Напагатове трымай вінтоўку!

Гэй, пролетары! вуліцы ўладар
З оркестрамі стройся ў калёны!
Нясі сьцягоў узбунтованы пажар
Наперакор нікчэмным забаронам
Хай сьвет рабаўнікоў дрыжыць
Ад кананады ўзбураных протэстаў:
Ім не схаваць крывавыя нажы
Пад палаой „міралюбівых" гэстаў.
Над падняволенай айчынай занясьлі
Драпежнікі сьмяртэльную вяроўку...
Таварыш мой! Будуючы социялізм,
Напагатове будзема трымаць
29/VII—30 г. вінтоўку!

Рэволюцыйнага руху ня спыніць

Белы тэрор як зброя падрыхтоўкі да вайн...

Ёсьць словы якія ніколі не забываецца і навек астаюцца ў гісторыі. Да ліку гэтых гістарычных слоў належыць славутае заяўленьне ката баўгарскіх рабочых і сялян—Ляпчава, якое было зьвернута да дэлегацыі працоўнай моладзі, што зьявілялася да яго для перадачы протэсту супроць бясчынстваў баўгарскай паліцыі і суду.

— Покуль вы ня здыміце лёзунг „прэч вайну супроць СССР, мы тэрору вя спынім! Я працуўнік СССР і буду змагацца супроць яго.

У гэтых словах цэлая програма, пад якой ахвотна могуць падпісацца і лідэр француськага імпэрыялізму Тардзье, і дыктатар Польшчы—Пілсудзкі, і нова выпечаны румынскі кароль—Кароль, і крывавы Аляксандр Юга-Слаўскі, і правіцелі фашысцкай Фінляндзіі, і социял-фашыстыя ўсіх масцей і ядценкаў.

Бо для таго, каб ваяваць, недастаткова адной арміі, танкаў, газаў, паветраных бомбамётаў. Трэба забясьпечыць бясьперабойны ход на прадпрыемствах і транспарце у часе вайны. Трэба бясьпынна забясьпечваць фронт, неабходны супакой унутры краіны, у тылу.

Вось чаму у пляне падрыхтоўкі да новай імпэрыялістычнай вайны і да паходу на Савецкі Саюз ва ўсіх капіталістычных краінах вялізарнай лавінай нарастае белы тэрор.

Буржуазныя урады зусім перасталі лічыцца з уласнымі законамі, ліквідуюць свабоду сходаў, саюзу, друку, дэпутацкую недатыкальнасьць. Галоўны удар накіраваны супроць компартыі, комсамолу і масавых рабоча-сялянскіх організацый, якія кіруюць барацьбой супроць пагрозы імпэрыялістычнай вайны і у абарону СССР.

У Францыі ужо 3-ці год сядзіць у турме засуджаны на 5 год за антымілітарыстычныя выступленьні і выкрыцьці антысавецкіх махінацый гэрой чорна-морскага паўстаньня, дэпутат парляманту—Андрэ Марці.

Дзесяткі рэдактароў комуністычных і комсамольскіх газэт адбываюць турэмныя прыгаворы за зьмяшчэньне антымілітарыстычных артыкулаў. Француcкі ўрад рыхтуючы забарону компартыі і комсамолу і рэволюцыйных профсаюзаў, зрабіў спробу сфабрыкаваць процэс „аб змове супроць унутранай і знадворнай небяспечнасьці дзяржавы", па якой ён намераваўся судзіць звыш 150 чалавек. Справа гэта была узьнята тры гады таму назад, але да гэтага часу, за адсутнасьцю падстаў, абвінаваўчы акт яшчэ ня складзен.

У Польшчы кінуты у турмы амаль усе дэпутаты-комуністы а таксама дэпутаты Беларускай Грамады і ўкраінскага Сельробу. Аб разнузданасьці польскага фашызму сьведчыць сьмяротны прыгавор вынесены у чэрвені 30 году львоўскім судом комсамольцам Гіршу, Папэру і Югэнду за распаўсюджваньне лістовак напярэдадні міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем. Удзел у рабочай дэлегацыі якая наведала СССР, зьяўляецца найвялікшым злачынствам у вачох польскага суду. У маі г. г. рабочыя Бас, Гункер, Боровяк і Габэр атрымалі за паездку ў СССР па 4 гады турмы,

У Румыніі сігуранцы склала нядаўна сьпіс усіх комуністых і другіх „ненадзейных" у Бесарабіі. Зразумела яны будуць безадкладна арыштаваны ў першы-ж час пасьля абвяшчэньня вайны. Такія-ж сьпісы маюцца і ў Польшчы: у іх лічыцца звыш 100000 чалавек, галоўным чынам украінцаў і беларусаў.

У Нямеччыне уведзены новы закон аб „абароне рэспублікі", накіраваны супроць комуністых. Ён значна пашырае правы паліцыі па парушэньні... бяз таго куцых свабод друку, ... союзаў і сходаў і значна узмацн... караньні для рэволюцыянэраў.

У ПАЗШ спэцыяльная парляманц... місія займаецца цяпер р... сьсьле... нем дзейнасьці компартыі. У мін... годзе электрычная крэсла пагр... 6 гастонскім тэкстыльшчыкам, ... цё якіх было выратавана толькі ... кую ы магутным протэстам міжн... нага пролетарыяту.

Цяпер амэрыканскі суд намерв... адправіць на сьмерць т. т. Пау... Карра і чатырох другіх рэволюц... раў за „мяцежную пропаганду".

Прыгавор да сьмерці пяці мэ... канскіх комуністых у Халапо, ра... дзіцячай дэмонстрацыі у Ра... (Чэха-Славакія), сыстэматычнае ... ваньне кулямётаў, газавых бомб... шай зброі вайны пры нападзен... рабочыя мітынгі, дэмонстрацыі і ... ты, масавыя процэсы (процэс ... Баўгарыі, „825" у Японіі, „31"— ... руце (Індыя), „122" у Вэнгрыі і ... масавыя забойствы Жылаўскіх і аў... лійскіх гарнякоў, крывавая ба... Вормсе, Гальле, Хартмансдорфе і ... —усё гэта ланцуг узмацняючагас... рору мэта якога—уціхамірыць ... чую клясу, разграміць яе ... клясавыя організацыі, зламаць яе ... праціўленьне наступленьню пра... емцаў у падрыхтоўцы вайны.

Рост белага тэрору пацьвярдж... статыстычнымі (далёка няпоўным... дзеным) выканкому МОПР.

Толькі у 1929 годзе у капітал... ных краінах, у калёніях было ... 140 тысяч 854 рэволюцыянэраў. ... на—65.761, пакарана сьмерцю па... —14.625. Прыгаворана да пажы... вага зьняволеньня 56, да турмы ... таргі 8.948 агульнай складанасьц... 16.784 гады. На 1-га студзеня ў ... мах буржуазіі утрымлівалася ... політзьняволеных.

Узмацненьне тэрору выразілас... сама у значным пагоршаньні тур... га рэжыму, разьлічанага на тое, ... канчатковага падарваць здароўе ... лонных барацьбітоў рэволюцыі, ... біць іх нязлольнымі да далейша... барацьбы.

Зьдзекі і уціск выклікаюць у ... масавыя галадоўкі політзьняволе... якія ня рэдка канчаюцца сьме... Буржуазія ўсё часьцей прыбягае... забойства політычных.

У польскіх турмах памерлі „ра... най сьмерцю" т. Ляпон, Сарока, Ко... берг і шэраг іншых. У Юга-... „пры спробе да уцяканьня" з... жандарамі член ЦК компартыі Д... віч, сэкратар Юга-Слаўскага МО... Гэчымовіч, Дэліч, і каля 150 д... таварышоў.

Паўсюды адбываецца цкаваньн... волюцыйных політэмігрантаў і ... шаецца права аховы.

З Францыі політ-эмігранты ... лаюцца сотнямі. Паміж урадамі ... і Італіі заключана умова аб вы... політ-эмігрантаў. Латвійскі ўрад ... штаваў пры пераездзе з Польш... СССР польскага рэволюцыянэра ... шына і перадаў яго агентам пол... ахранкі.

У студзені 30-га году на Кубе ... арыштаваны чатыры кітайскія ко... сты, іх адправілі на амэрыканскі ... енны карабель, які даставіў ... Шанхай і перадаў у рукі катаў ... Кай-Шы.

Такая ў самых кароткіх рысах ... ціна шалёных прасьследваньняў ... абрушваюцца буржуазіяй на р... цыйных рабочых і сялян, што з... юцца супроць ваеннай небясьп... выступаюць у абарону СССР.

Кляса супроць клясы

1-га жніўня—дзень агляду баявых сіл сусьветнага пролетарыяту

1-ае жніўня 30 году спаўняецца 16 гадавіна са дню абвяшчэньня сусьветнай імпэрыялістычнай вайны. Гэтая дата на многія пакаленьні застанецца у памяці працоўных мас.

Сусьветная вайна—гэта найвялікшае злачынства буржуазіі—настолькі ярка у самай аголенай форме паказала, да чаго вядзе капіталістычнае панаваньне, што ня выказаць у дзень свайго гнеўнага протэсту ні адзін сьвядомы працоўны ня можа.

Горы трупаў, тысячы спаленых гарадоў і вёсак, мільярды народных грошай, зьвернутых у парахавы дым, цэлыя арміі пакалечаных і згубіўшых здольнасьць да працы, вялізарнейшае беспрацоўе—вось балянс гэтай бойні, якую буржуазія пры актыўнай дапамозе социял-здраднікаў усіх адценкаў абвясьціла „апошняй вызваленчай" вайной.

Якая нікчэмная іронія! Не пасьпеў літаральна высахнуць атрамант на рабункавых вэрсальскім догаварах, як з усіх канцоў земнае кулі ізноў загарэліся агні вайны, зноў пачала ліцца кроў прыгнечаных народных мас. Усе гэтыя 16 год былі гадамі бясьперапынных крывавых сутычак паміж эксплёататарамі і эксплёатуемымі, паміж імпэрыялістымі і прыгнечанымі народамі калёній.

Гэроічная барацьба працоўных Кітаю, паўстаньне ў Палестыне і ў Сірыі, рэволюцыйна-вызваленчы рух у Індыі і Інда-Кітаі,—вось найбольш значныя факты, якія паказваюць, што вэрсальская ўмова супроць запэўніваньням паноў социял-дэмократаў, міра нідзе ня ўтварыла, а наадварот сама стала крыніцай новых боек.

Зараз мы зьяўляемся сьведкамі вялікага па свайму размаху сусьветнага экономічнага крызісу. Капіталістычнае „процветание" трашчыць па ўсіх швах. Гарады Эўропы і Амэрыкі запоўнены мільённымі натоўпамі беспрацоўных.

Унутраныя і знадворныя супярэчнасьці, якія разьядаюць капіталістычныя дзяржавы, дасягнулі крайняй ступені гастраты. І толькі на адной шостай частцы зямное кулі—у СССР пераможна лунае чырвоны сьцяг социялізму, ідзе пры ўдзеле мільённых мас нябачная ў гісторыі будоўля новай социялістычнай грамады. Таварыш Сталін у сваёй справаздачы на ХУІ зьездзе УсеКП(б) даў бліскучую па сваёй кароткасьці і яскравасьці характэрыстыку таго што робіцца у нас і ў іх:

У іх, у капіталістаў—экономічны крызіс і упадок вытворчасьці, як у галіне прамысловасьці, так і у галіне сельскай гаспадаркі.

У нас, у СССР экономічны уздым і рост вытворчасьці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

У іх, у капіталістаў пагоршаньне матар'яльнага становішча працоўных, зьніжэньне заработнай платы рабочых і рост беспрацоўя.

У нас, у СССР—уздым матар'яльнага становішча працоўных, павышэньне заработнай платы рабочых, і скарачэньне беспрацоўных

„Яны"—гэта значыць капіталістыя і іх социял-фашысцкія лёкаі ставяць на парадак дню новую вайну, новы перадзел сусьветных рынкаў, рыхтуюцца да таго, каб сьцерці з твару зямлі ненавісны ім Савецкі Саюз. У правадзеньні гэтай вайны імпэрыялістыя імкнуцца забясьпечыць свой тыл, пакончыць з рэволюцыйнай заразай.

Белы тэрор, крывавая расправа з перадавымі барацьбітамі рэволюцыі—сталі вышэйшай формай праяўленьня дзяржаўнай мудрасьці правячых клясаў. У „дэмократычнай" Эўропе турмы і казэматы поўны лепшых прадстаўнікоў рэволюцыйнага пролетарыяту і беднейшага сялянства. „Права аховы"—стала шматком паперы, клясавы суд буржуазіі дзейнічае „хутка і міласьціва", адпраўляючы пролетарскіх рэволюцыянэраў на доўгія гады катаргі і ссылкі. У Італіі, Румыніі, Інляндзіі, Баўгарыі, Вэнгрыі, Юга-Славіі—запраўляюць фашысты. Вось няпрыглядная карціна „стабілізованай" Эўропы і Амэрыкі на сёньняшні дзень.

Пакончыць з гэтым ганебным рэжымам рабства і кабалы можа толькі рэволюцыйны пролетарыят пры падтрымцы шырокіх мас працоўнага сялянства ў саюзе з паўстаўшымі народамі прыгнечаных калёній.

Мы бачым нарастаньне рэволюцыйнага ўздыму рабочае клясы. З надзеяй глядзяць прыгнечаныя масы ўсяго сьвету на вольны Савецкі Саюз,—бацькаўшчыну сусьветнага пролетарыяту. Якія-б хітрыя пляны не будавалі імпэрыялістыя, спачуцьцё мільёнаў працоўных на баку СССР, дзе працоўныя ўсіх нацыянальнасьцей у брацкім яднаньні перайшлі ў шырокае социялістычнае наступленьне на апошнія рэшткі капіталізму.

„Вайна! вайне!", „Ператворым вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую!", „На абарону Савецкага Саюзу!"—гэтыя лёзунгі будуць паўтораны мільёнамі працоўных у дзень 1-га жніўня.

У гэтай масавай мобілізацыі працоўных мас супроць насьпяваючай сусьветнай бойні—прымае самы актыўны ўдзел і МОПР.

Пад сьцягам баявога інтэрнацыяналізму, пад сьцягам міжнароднай пролетарскай солідарнасьці МОПР'аўцы СССР будуць выступаць у гэты дзень. Трэба зрабіць так, каб дзень 1 жніўня быў пачаткам перабудовы работы МОПР'у на новых пачатках. МОПР павінен паказаць сябе на справе, як моцны прывадны рамень ад партыі да мас.

Дзень 1-га жніўня — організацыя МОПР'а праводзіць разам з ТСО-Авіахэмам. Для Мопраўскіх організацый гэты дзень павінен быць днём праверкі яго здольнасьці перабудоўвацца на хаду і яшчэ шырэй, чым дагэтуль несьці ў масы ідэі інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Дзень 1 жніўня пакажа ўсяму сьвету адзінадушша рэволюцыйных працоўных мас у барацьбе супроць ваеннай небясьпекі. МОПР і АСО-Авіахэм павінны быць на перадавых пастах савецкай грамадзкасьці, праяўляючы ўсюды прыклад організаванасьці і грамадзкай дысцыпліны.

Г. Гэйлер

МІЖНАРОДНАЯ ЗГРАЯ ОРГАНІЗАТАРАЎ АНТЫСАВЕЦКАГА ПАХОДУ

Чэмбэрлен — Пуанкарэ — Цэргібель — Брыян — Пілсудзкі — Дэтэрдынг — Рымскі папа — Хікс — Чан-кай-шы

ПРОЛЕТАРЫ УСЯГО СЬВЕТУ ГАТОВЫ ПРАЛІЦЬ КРОЎ ЗА СССР

Сёньня—у Міжнародны Чырвоны дзень працоўныя ўсяго сьвету ўзьнімуць голас протэсту супроць ваенных плянаў міжнароднага імпэрыялізму, супроць падрыхтоўкі нападу на СССР

Гавораць ахвяры капіталістычных турам

Голас адважных рэволюцыянэраў, на доўгія гады адарваных ад рэволюцыйнай барацьбы за вызваленьне рабочае клясы—моцна прагучыць ва ўсім сьвеце і ўзьніме на барацьбу з капіталізмам сотні тысяч новых пролетараў

З румынскіх турмаў

Урад жадае ажыцьцявіць свой плян фізычнага зьнішчэньня політзьняволеных

Становішча ў турмах пагаршаецца. У Вакарэштскай турме нашых т. т. пасадзілі разам з крымінальнымі, дзе іх штодзённа падпарадкоўваюць зьневажаньням і ўціскам. Яны пазбаўлены магчымасьці бачыцца з сваімі сем'ямі і з надворным сьветам. Яны рыхтуюцца абвясьціць галадоўку.

У Дофтане таварышы знаходзяцца ў адзіночных камэрах і па паказаньнях сігуранцы турэмны рэжым значна пагоршан.

Таварышы Міхай Язэп, Фінкель Язэп, Клейнман Майсей і Фогель Павел былі закаваны ў кайданы і кінуты ў найгоршую камэру.

Сьвет у камэры пагас, бо ўся газа вышла. Да іх ужываюць усялякія пагрозы і прымушаюць працаваць, згодна новага закону аб турэмным рэжыме, закон гэты ўведзен нацыянал-царанісцкім урадам пры садзейнічаньні соцыял-фашыстых.



„Цывілізаваны" прыгнетацель капіталу

У Місьліі дзьве політзьняволеныя жанчыны спынілі галадоўку. Яны вытрымаліся на працягу 40 дзён і зараз знаходзяцца пры сьмерці. Ня гледзячы на гэта турэмнае начальства адмаўляе ім ва ўсякай лячэбнай дапамозе.

Урад жадае ажыцьцявіць свой плян фізычнага зьнішчэньня зьняволеных таварышоў.

У ваеннай турме Таргу Сор рэжым настолькі жорсткі, што вельмі шмат хто думае аб самагубстве.

У Буковіцкай турме становішча аналёгічнае. У бліжэйшы час мы яшчэ больш падрабязна апішам становішча ў турмах.

З прывітаньнем (подпісы)

Мы верым у канчатковую перамогу пролетарыяту над буржуазіяй

Ліст румынскага політзьняволенага

Таварышы!

Прыехаўшы ў СССР, на бацькаўшчыну ўсіх рабочых і сялян, я павінен у першую чаргу, перадаць вам братэрскае прывітаньне ўсіх зьняволеных румынскіх турам і запэўніць вас у тым, што політзьняволеныя румынскіх турам, ня гледзячы на ўсе цяжкасьці, усе катаваньні, ня перастаюць верыць у канчатковую перамогу рабочае клясы над буржуазіяй.

„Ні на хвіліну,—гавораць таварышы,—мы не забываем аб тым, што мы на доўгія гады адарваны ад рэволюцыйнага фронту барацьбы за вызваленьне рабочае клясы".

Таварышы, ваша матар'яльная, а ў асаблівасьці, моральная дапамога мае вялізарнейшае значэньне для нашага ўнутрытурэмнага жыцьця. Матар'яльная дапамога дае нам магчымасьць выжыць тыя доўгія гады, да якіх мы прысуджаны, бо румынская буржуазія нічога больш табе ня дае ў турме, як 500 гр. кукурузнай мукі (ці мамалыгі) і трохі цёплай вады. Моральная дапамога падтрымлівае ў нас тую бясконцную веру ў перамогу, якая дае магчымасьць перанесьці ўсе ўдары з боку турэмнай адміністрацыі, з якой мы так бесьперапынна змагаемся.

Таварышы, праўда, што мы не заўсёды атрымоўваем усё тое, што вы нам перасылаеце; умовы нашы вельмі цяжкія, але тое малае, што мы атрымалі, мела вялікае значэньне.

Вашыя лісты ўносяць у нашу турму жыцьцё, падымаюць энтузіязм і мы тады лягчэй пераносім той прамежак часу, што нас ад вас аддзяляе. Праўда, што мы вельмі рэдка адказваем, але гэта не па нашай віне, умовы турмы суровыя, вельмі частыя галадоўкі і арышты там заўсёды перашкаджаюць нам адказваць вам акуратна і рэгулярна, тым ня менш уплыў усіх вашых лістоў ня зьмяншаецца і я звараюся да вас ад імя ўсіх політзьняволеных Румыніі з заклікам ня спыняць пісаць нам.

Пішыце нам чым больш, бо гэтымі лістамі мы жывем і дышым, калі вы не атрымаеце адказу, ведайце, што кулак сьціснуўся мацней, што тэрор больш моцны і мы яшчэ больш адчуваем патрэбу ў вашым жывом слове, у вашым моральным і матар'яльным падтрыманьні.

Няхай жыве барацьба за вызваленьне сусьветнага пролетарыяту!

Няхай жывуць шэфствуючыя пролетары над капіталістычнымі турмамі!

Няхай жывуць рэволюцыянэры, кінутыя ў капіталістычныя турмы!

Політзьняволены румынскай катаргі, які прасядзеў 9 год, **Дубінскі.**

Пасьпяховае выкананьне гаспадарча-політычных задач соцбудаўніцтва ў СССР

мае вялізарнае значэньне для справы міжнароднай пролетарскай рэволюцыі

(Са звароту ЦК МОПР'у да ўсіх членаў МОПР'у СССР)

Ва ўсіх капіталістычных і колёніяльных краінах разгортваюцца рэволюцыйныя клясавыя бойкі.

Барацьба з растучай актыўнасьцю рабочай клясы ідзе пад знакам разгулу крывавага белага тэрору.

За прыналежнасьць да рэволюцыйнай організацыі буржуазія карае катаргай і растрэлам. Аб гэтым павінен памятаць кожны член МОПР'у, аб усім гэтым павінен ведаць кожны працоўны нашага союзу.

Шматмільённая армія членаў МОПР'у СССР павінна ў дзень 1-га жніўня яшчэ больш згуртавацца вакол задач, якая забясьпечваюць далейшыя перамогі будаўніцтва соцыялізму.

Неабходна памятаць, што пасьпяховае выкананьне гаспадарча-політычных задач соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР мае вялізарнае значэньне для справы міжнароднай пролетарскай рэволюцыі.

Колькі каштавала імпэрыялістычная вайна

МАСКВА, 31. Прайшло 16 год з дню абвяшчэньня імпэрыялістычнай вайны. Вынікі яе такія: забіта і памерла ад ран 10 мільёнаў чалавек. Пакалечана 4 мільёнаў, раненых пасьля вайны засталося 20 мільёнаў чалавек.

Павялічылася ў сувязі з вайной сьмяротнасьць на 15 мільёнаў чалавек і скараціўся прырост на 20 мільёнаў чалавек.

500 міліярдаў залатых рублёў паглынула сусьветная вайна. Капіталы буржуазіі ўзрасьлі ў 12 раз. Карысны мэталь (сьвінец, жалеза, сталь) быў ператвораны у 80 міліёнаў снарадаў і 15 міліярдаў куль. Рост узбраеньня ў капіталістычных краінах працягваецца бесьперапынна:

Бюджэты ваенных міністэрстваў павялічаны ў параўнаньні с 1913 годам у Ангельшчыне на 33 проц., у ПАЗШ—на 124 проц., і ў Японіі—154 проц., Буржуазія цесна організуе свае фашысцкія атрады. Ва Францыі ў гэтых атрадах налічваецца 1185000 чалавек, а ў Амэрыцы—1893000 чалавек, у Польшчы—1865 тысяч чалавек і ў Італіі—216800 чалавек.

Голас палонных салдатаў рэволюцыі

Другі раз праводзіць пролетарыят усяго сьвету Міжнародны Чырвоны Дзень—дзень барацьбы супроць імпэрыялізму, супроць ваеннай небясьпекі. Да гэтага дня рыхтуецца рабочыя кляса СССР, рыхтуюцца рэволюцыйныя рабочыя, сяляне капіталістычных краін і колёній.

Падрыхтоўка ідзе ня толькі на фабрыках, заводах, на воле, яна ідзе і за турэмнымі сьценкамі, дзе людзі, адрэзаныя ад жыцьця і таварышоў, працягваюць барацьбу. Барацьба гэта жорстка і сурова, але ў ёй ёсьць і свае радасьці. Гэтую радасьць дае салідарнасьць політзьняволеных, бясьсільле турэмнай адміністрацыі зламаць іх стойкасьць і аднадушша. Гэтую радасьць даюць весткі з краіны будуючагася соцыялізму.

Ужо зараз напэўне пішуцца на тонюкіх паперках лісты, прывітаньні і адозвы.

„Гэройскаму пролетарыяту СССР"—пісалі ў мінулым годзе ў дзень 1-га жніўня 180 політзьняволеных Ковенскай турмы ў Літве—„Сёньня Чырвоны Дзень"—дзень барацьбы супроць імпэрыялістычных войн і абароны СССР, мы не жадаем адставаць ад рэволюцыйнага пролетарыяту ўсяго сьвету. Хоць мы замураваны ў каменных мехах і адлучаны ад нашых клясавых братоў жалезнымі кратамі і тоўстымі каменнымі сьценамі, мы усё-ж ні на адну хвіліну не адстаем ад тэй барацьбы, якую вядзе пролетарыят як нашай краіны, так і ва ўсім сьвеце.

Мы ня маем магчымасьці актыўна ўдзельнічаць у вулічных дэмонстрацыях і забастоўках. Тым ня менш і мы далучаем свой голас да протэсту ўсяго рэволюцыйнага пролетарыяту, абвяшчаючы аднадзейную галадоўку протэсту, з гукамі рэволюцыйных сьпеваў і ўпрыгожваем чырвонымі значкамі і адпаведнымі лёзунгамі свае камэры. Пры першай магчымасьці мы дакажам, што зможам абараніць нашу бацькаўшчыну—СССР ня толькі голасам протэсту, але і дзеяньнем".

Політзьняволеныя Ворненскага концэнтрацыйнага лягеру ў Літве ў лісту да шэфствуючай над імі організацыі МОПР'у Юр'ева-Польскім Івана-Вазьнясенскай вобласьці апісваюць як прайшоў дзень 1-га жніўня ў турме:

„Разам з сусьветным пролетарыятам мы сьвяткуем рэволюцыйныя сьвяты ня гледзячы на бязьлітасныя рэпрэсіі з боку адміністрацыі. Вось, таварышы, як мы асьвяткавалі Чырвоны Дзень—1-ае жніўня: з раніцы панадзявалі чырвоныя банцікі і вышлі на прагулку. Адміністрацыя, ашалеўшы, пачала іх зрываць. Потым нас загналі: адных у карцар, другіх у сутарэньне, але гэтым фашыстыя нічога не дабіліся, не паслабілі рэволюцыйнага настрою. Каля 9 гадзін усе сьпелі Інтэрнацыянал", затым чыталі рэфэраты. За сьвяткаваньне фашысты нас пакаралі карцэрам".

З вялічэзнай любоўю пішуць політзьняволеныя сваім шэфам чырвонаармейцам.

„Вашае палкае прывітаньне, замацаванае 64-ма подпісамі, уласнаручнымі чырвонаармейскімі подпісамі, мы атрымалі,—пішуць політзьняволеныя Мокотаўскай турмы ў Польшчы.

... „Ваш ліст перапоўніў нас вялікай радасьцю.

... Для нас усіх, аднолькава як і для ўсіх сьвядомых рабочых і сялян Польшчы, Чырвоная армія—гэта наша армія, наша родная, любімая, наша надзея і наша абарона.

Яны апісваюць чырвонаармейцам, як жывецца польскаму салдату.

„Рабочы і селянін, забраны сілком у армію, увозіцца на сотні кілёмэтраў ад сваіх родных месц. Там ён становіцца безабароннай ахвярай афіцэраў, гэтых фабрыканскіх і панскіх сынкоў. Рабочы і селянін у салдацкім мундзіры пазбаўлен усялякіх праў, а мордабой прадстаўляе сабой бытавое зьявішча ў польскай арміі" (з лісту політзьняволеных Ломжынскай турмы чырвонаармейцам №-кага чыгуначн. палку).

За выкрыцьцё сапраўднага становішча салдата ў буржуазнай арміі рэволюцыйныя рабочыя плацяцца доўгімі годамі зьняволеньня, але гэта не застанаўлівае іх. Наадварот, нават суд выкарыстоўваюць яны, як трыбуну

На нашых вачох усё часьцей салдаты адмаўляюцца страляць у рэволюцыйных рабочых і сялян і пераходзяць на іх бок. На нашых вачох адбываюцца рэволюцыйныя ўспышкі і бунты у арміях і у флоце капіталістычных дзяржаў. Праз сьцены ваеннай турмы Клерво француцкія салдаты і маракі на чале з Андрэ Марці падымаюць свой голас на абарону СССР.

— Мы, пішуць політзьняволенныя з Польшчы—накіроўваем свае вочы ў будучае, калі Чырвоная мяжа прасунецца на Захад і калі мы аб'яднаемся з Вамі у адзіным Савецкім Саюзе.

... Зараз працоўныя, навучаныя горкім вопытам, не стануць праліваць сваю кроў за буржуазію і страляць у сваіх братоў рабочых і сялян Савецкага Саюзу, а наадварот, найбольш сьвядомыя з іх накіроўваюць дула пушак і вінтовак супроць свайго клясавага ворага і ў абарону СССР. Масы-ж пойдуць за авангардам".

Так пішуць з польскай турмы, так пішуць з турам усіх краін, адкуль толькі можа прарвацца хоць маленькая запіска. Такую пісульку у мінулым годзе прыслалі да дню 1-га жніўня і політзьняволеныя Сун-Тай-Мун у Корэі.

Яны пішуць:—„Сусьветны пролетарыят, паспрабаваўшы на сябе усе цяжкасьці с сьветнай вайны 1914-1918 гадоў і які упэўніўся ўласнымі вачыма у існаваньні і росьце пролетарскай дыктатуры ў СССР, зможаператварыць будучую імпэрыялістычную вайну у Сусьветны Кастрычнік".

На абарону СССР!—нясецца кліч па кутках зямной кулі. І чым больш пагроза вайны, чым мацней падрыхтаваньні імпэрыялістых, тым магутней перакатваецца па ўсяму сьвету гэты кліч.

Д. В

Рыхтуюць зрыў 1-га жніўня

ВЕНА. З Бухарэсту паведамляюць аб энэргічных мерапрыемствах паліцыі і Румынскай ахранкі да зрыву анты-ваеннага дню—1 жніўня. У сувязі з сялянскімі хваляваньнямі ў Бэсарабіі асаблівая ўвага ўдзелена Кашыневу. Па паведамленьнях з Ясс паліцыя выкрыла быццам-бы конспіратыўную кватэру компартыі. У Сяміградзьдзі паліцыя арыштавала групу моладзі, наладзіўшай нарады для падрыхтоўкі к 1-му жніўню. Арыштаваныя цяжка набіты і падпарадкаваны катаваньням.

Крывавыя сутычкі рабочых з паліцыяй у Шанхаі

Ёсьць забітыя і параненыя

ШАНХАЙ, 30. Барацьба бастуючых рабочых трамвайнай кампаніі ў Французскай концэсіі Шанхай дасягнула шырокага напруджаньня і адзначылася крывавымі сутычкамі з паліцыяй. Штодзённа адбываюцца сутычкі паміж бастуючымі і паліцыяй. Бастуючыя нападаюць на трамвай, разьбіваюць вагоны, закідваюць іх каменьнямі. Гэтымі днямі некалькі сот стачачнікаў разбурылі клюб „Дзэйльных рабочых" Падасьпеўшая паліцыя адкрыла страляніну. Адзін рабочы забіты, некалькі чалавек ранена, звыш 20 чалавек арыштавана.

Інтэрнацыянальнае зьяднаньне працоўных мас—сіла, аб якую разаб'ецца фронт сусьветнай рэакцыі

Ів. Малчанаў.

Вялікі лёт

Не заморыцца моцны матор,
Ня дрогне ў лёце кабіна...
Сёньня мы па—над грэбнямі гор,
Заўтра—ля берагоў Сахаліна.

Імчыся ў сьвет нашых спраў веснаход,
Разьлівайся ў імпэт гурагана,
Мы крылом прашчурным аб Усход,
Аб прыбой ледзяны акіяна.

Весялей-жа, матор, весялі
Алюмінівай песьняю сіні.
Мы надорым савецкай зямлі
Бесканчонасьці сонечных ліній...

Вось ужо ўсхваляваўся Іртыш
І хіснуліся ветліва елі!

Залатую таежную ціш
Узбаламуціў савецкі пропэлер.

І над морам разьбегам прыгожым,
Дзе сярдуюць халодныя хвалі,—
Наша воля, упартасьць і розум
Размаўляюць на гутарцы сталі.

Калі вораг захоча наш лёт
Затрымаць, ці хаця-б патрывожыць,
Зможам мы свой любы самалёт
Кулямётам сваім упрыгожыць!

Весялей, весялей-жа, матор!..
Расьцілаюцца мірна даліны...
Сёньня мы па-над грэбнямі гор,
Заўтра—ля берагоў Сахаліна.

З фронту ўборачнай кампаніі

БРАЦЬ РАЎНЕНЬНЕ НА ЛЕПШЫХ

КОЛГАСЫ, ВЫКАРЫСТОЎВАЮЧЫ ЛЕПШЫЯ МЭТАДЫ РАБОТЫ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ—З ПОСЬПЕХАМ ПРАВОДЗЯЦЬ УБОРАЧНУЮ

Комсамолія Заслаўшчыны і чыгуначных ячэек ст. Ворша дапамагаюць колгасам убіраць ураджай

Комсамольскія і піонэрскія брыгады на дапамогу ўборачнай кампаніі

Адрамантаваны цягнік—у падарунак асеньнім перавозкам

Комсамольская організацыя ст. Ворша распачала вялізарную працу па падрыхтоўцы да асеньніх перавозак, уборкі ўраджаю і хлебазагатовак.

Ячэйкай пасланы ў паўшэфныя колгасы 3 комсамольскія брыгады, якія прабудуць там ня менш 3-х тыдняў.

Курсанты курсаў ДСП свае выхадныя дні скарыстоўваюць на працах у бліжэйшых колгасах, дзе дапамагаюць убіраць ураджай і праводзяць растлумачальную працу вакол хлебазагатовак.

Вучні школы ФЗВ у колькасьці 126 асоб узялі на сябе абавязак у пачатку жніўня выехаць у бліжэйшыя падшэфныя колгасы для дапамогі ва ўборцы ўраджаю, адрамантаваньня інвэнтару да асеньня-пасяўной кампаніі і памяшканьняў для складваньня збожжа.

Школа ФЗВ узяла абавязак адрамантаваць у звыштэрміновы час адзін цягнік у падарунак асеньнім перавозкам. Курсанты курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ 25-га выехалі да ст. Барысава і правялі растлумачальную працу сярод сялянства і колгасьнікаў па пытаньню хлебазагатовак. Грошы за абслугоўваньне саставу курсанты аддалі на карысьць колектывізацыі.

Ад комсамольцаў не адстаюць і піонэры. Піонэрскія атрады выехалі ў падшэфныя раёны, дзе праводзяць работу па зборы мяшкоў і культурную працу сярод дзяцей колгасьнікаў. Атрады „Лёгкай кавалерыі" пачалі сталую праверку падрыхтоўкі належных установаў да асеньніх перавозак

Хадневіч.



На уборцы ураджаю

Абвясьцілі сябе ўдарнікамі

Мы, комсамольцы, ячэяк колгасаў **„Актывіст і „імя Леніна"**, Прусаўскага с-с, Плешчаніцкага раёну (Меншчына) абвяшчаем сябе ўдарнікамі і залючаем паміж сабою соцыялістычны дагавор на лепшае правядзеньне ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы і бярэм на сябе наступныя абавязкі.

1. Скласьці комсамольскія ўдарныя брыгады па ўборцы ўраджаю і правядзеньня асеньняга севу.
2. Організаваць 2 нядзельнікі, з якіх адзін на карысьць колгасаў, а другі ў абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.
3. Організаваць насьценныя газэты, у якіх асьвятляць ход уборачнай і асеньня-пасяўной кампаніі і ход выкананьня соцыялістычнай умовы.
4. Падняць палітычны ўзровень кожнага комсамольца.
5. Усім комсамольцам няколгасьнікам уступіць у колгасы.
6. Выклікаць на соцыялістычнае спаборніцтва Акалоўскую, Хатавісаенскую і Амлешаўскую ячэйку.

Вынікі выкананьня соц. умоў зрабіць у канцы кастрычніка месяцы і асьвятліць іх у газэце „Чырвоная Зьмена".

УБОРКУ ЖЫТА ПРАВОДЗІМ ПА ЎДАРНАМУ

Колгас імя **Чарвякова**, Пухавіцкага раёну (Меншчына), сваечасова падрыхтаваўся да ўборачнай і асеньняй пасяўной кампаніі. Усе машыны патрэбныя на ўборку і асеньнюю сяўбу, поўнасьцю адрамантаваны. Рабочая сіла ўлічана і падзелена на брыгады. Брыгады абвясьцілі сябе **ўдарнымі па правядзеньню ўборачнай і асеньняй пасеў-кампаніі**.

Колгас закончыў уборку сена, а зараз пачаў ударную работу па ўборцы жыта.

Боська.

УБОРКУ СЕНАЖАЦІ ЗАКОНЧЫЛІ РАНЕЙ ТЭРМІНУ

Зімой 1930 г. у в. **Целькаў** організаваўся колгас імя «Беларускай Вёскі». Вясеньні сеў колгас правёў з бальшавіцкай напорыстасьцю, дзякуючы чаму пасяўныя пляны былі перавыкананы.

Ня гледзячы на недахоп рабочай і цягавай сілы, ударныя брыгады аратых і сяўцоў, не пакладаючы рук, прапавалі ў часе сяўбы. Пасьля сяўбы колгас прыступіў да пабудовы хлявоў для жывёлы.

Уборачную кампанію колгасьнікі таксама сустрэлі падрыхтаванымі, у часе ўборкі сенажаці было разгорнута соцспаборніцтва, дзякуючы чаму апошняя закончылася раней вызначанага тэрміну.

Свой.

Дапамагаюць колгасам ва ўборцы ўраджаю

Комсамольская організацыя Заслаўшчыны вялікую дапамогу аказала многім колгасам ва ўборцы сенажаці. Так, напрыклад, Заслаўская мястэчковая ячэйка тры разы наладжвала суботнікі ў колгасе „Чырвоны Прамень". І зараз у колгасе працуюць комсамольцы, якія дапамагаюць ва ўборцы збожжа. Ад Заслаўскай ячэйкі не адстала Ратамская ячэйка, якая дапамагла колгасу „Кастрычнік Рэволюцыі" убраць конюшыну і сена.

Іншыя вясковыя ячэйкі комсамолу кожны дзень сыстэматычна пасылалі комсамольцаў працаваць у колгасы.

Яшчэ лепш паказалі сябе ў працы колгасныя ячэйкі. Так, ячэйка колгасу „Чырвоная Зорка" організавала ўдарную брыгаду, **якая ў часе ўборкі была першай сярод астатніх колгасьнікаў.** Комсамольскія ячэйкі колгасаў добра па ўдарнаму працавалі ў часе ўборачнай, што дало магчымасьць хутчэй **закончыць уборку.**

Але трэба адзначыць, і недахопы, якія мелі і маюць месца ва ўборцы: пры колгасах няма майстэрняў для рамонту сел.-гаспадарчых уборачных машын. З за чаго часта прыходзіцца ехаць за дзесяткі вёрст, каб адрамантаваць машыну.

А. Верас.

Чарговае звальненьне з РСЧА

За подпісам намесьніка старшыні РВС СССР тав. Гамарніка аддан загад аб чарговым звальненьні ў бястэрміновы водпуск і ў запас РСЧА чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў прызыву 1928-1927-1926 гадоў.

Звальненьне пачынаецца 25 верасьня і працягнецца да 15-га сьнежня.

„Пяцігодка—ў чатыры гады"

Масавай падпіскай на пазыку забясьпечым тэмпы соц. будаўніцтв

„Бальшавік" рэалізуе па-больш віцку

Падрыхтоўчая праца па рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады" праведзена па заводу добра і сваечасова.

Пытаньне аб пазыцы абгаварвалася на цэхавых сходах. Паасобныя цэхі і брыгады ўступілі паміж сабою ў спаборніцтва на хутчэйшае сканчэньне падпіскі і 100 проц. ахапленьне пазыкаю.

Добра скарыстана насьценная газэта, якая ўвесь час стала высьвятляе ход рэалізацыі пазыкі. Пытаньню рэалізацыі быў прысьвечаны спэцыяльна нумар шматтыражнай газэты. Комсамольцы і партыйцы ахоплены падпіскай амаль на 100 проц.

У выніку добра праведзенай падрыхтоўчай працы ўжо зараз падпіска складае звыш 50 проц. заробатку рабочых, а агульная сума падпіскі на пазыку складае больш 31000.

Завод „Бальшавік" уступіў у спаборніцтва з абутковай фабрыкай

Нічога ня робяць

МК № 3 службы шляху і камісія садзейнічаньня працы па рэалізацыі пазыкі яшчэ не разгарнулі.

Да гэтага часу не праведзена ніводнага сходу прысьвечанага пазыцы. Растлумачальнай працы аб пазыцы сярод рабочых не вядзецца. Мэтады соцспаборніцтва ня ўжываюцца. Насьценгазэта на сваіх старонках пытаньне аб пазыцы зусім ня высьвятляе.

Мясцком аб'ядноўвае 202 чалавекі, а падпіскай ахоплена толькі 163 рабочых на агульную суму 4590 р.

У майстэрнях маецца шмат сэзонных рабочых, сярод якіх чамусьці пазыка зусім ня рэалізуецца.

Вагонныя майстэрні ідуць уперадзе

Кампанія рэалізацыі пазыкі па вагонных майстэрнях ідзе шпаркімі крокамі. У рэалізацыі прымаюць актыўны ўдзел ня толькі комсод, але і мясцком, партыйныя і комсамольскія ячэйкі.

Растлумачальная праца разгорнута добра. Праведзена шмат гутарак і дакладаў у часе перапынкаў аб значэньні пазыкі „Пяцігодка — у чатыры гады".

Пытаньні пазыкі добра высьвятляюцца ў насьценнай газэце. рабочых ёсьць значная частка, падпісаліся на месячны зараб... З прычыны таго, што гэта распачата нядаўна, пакуль-што ...лена падпіскай каля 50 проц. ...чых і агульная сума падпіскі ...дае 6295 р.

Вагонныя майстэрні МББ ч... кі ідуць першымі па вузлу ...гункі г. Менску. Раўняйцеся ...

Працуюць па пля...

Абсьледваньне мясцкому ... пасажырскай МББ чыгункі ... ла ўмелую настаноўку пра... рэалізацыі пазыкі і актыў... мясцкому.

Маецца спэцыяльны кут... дзяржпазыкам. Атрыманыя ... тар'ялы сваечасова разьмяркоў... ца паміж цэхаў. Большасьць ... ахоплена соцыялістычным сп... ніцтвам. З 271 чалавека, аб... ных мясцкомам, падпісалася ... 200 чалавек, і агульная сума ... піскі складае 85,5 проц. да ... месячнага заработку падпісаўш...

Комсамольцы кача...

Камісія садзейнічаньня пр... маларамонтных майстэрань ... жырскай МББ чыгункі зусі... разгарнула сталай працы па ... зацыі пазыкі. Гэта праца пра... ца мясцкомам.

Партячэйка зусім недаст... зьвяртае ўвагу на ход рэалі... пазыкі. Партыйцы і комса... слаба ўцягнуты ў падпіску. З ... чыхся 109 комуністых падпі... толькі 58 чал., комсамольцы ... лены толькі да 20 проц. С... борніцтва не разгорнута. З ... нага ліку рабочых падпісала... гэтуль меншая палова, на агу... суму 6945 р.

„Уліта едзе, калі ... будзе"

На шчотачнай фабрыцы да ... часу нічога ня чуць аб п... Фабком і комсод бязьдзейні... Аб пазыцы пачалі гаварыць ... два дні назад. На фабрыцы ... 722 рабочых, патрэбна, каб ... іх тэрмінова была разгорнута ... ца па падпісцы на пазыку „... годка—у чатыры гады".

Адказны рэдактар—Рэдколегі...

Згублены

— Мэтрычн. выпіс на імя Пічука С. С., выд. Сьмілавіцкім Загсамі пры РВК.

— Вайсковы білет, на імя Шатэрніка П., выд. Сьмілавіцкім ваенсталом.

— Даведка аб дазволе на ... аружжа „Анг. Сміт", 546681, ... Макарэвіч В. С., выд. Менск ...

— Мэтрычн. выпіс на імя ... А. Я., выд. Сьмілав Загсам, пр...

— Пашпарт на імя Ашкеназ... выд. Менакрміліцыяй.

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599